ПРАЛЕТАРЫІ ЎСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

# БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ

ГАЗЕТА УЗНАГАРОДЖАНА ГАНАРОВАЙ ГРАМАТАЙ ВЯРХОЎНАГА САВЕТА БССР

1987
26 лістапада
чацвер
№ 32 (1553)

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, КАМСАМОЛЬСКАГА І ПРАФСАЮЗНЫХ КАМІТЭТАЎ БЕЛАРУСКАГА ОРДЭНА ПРАЦОЎНАГА ЧЫРВОНАГА СЦЯГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ У. І. ЛЕНІНА

## Беларускі універсітэт. Тэлетайп. Учора · сёння · заўтра

### НА ПАСЯДЖЭННІ

бюро парткома абмеркавана работа навукова-даследчай часткі універсітэта па ўмацаванню сувязей навукі і вытворчасці ў святле рашэнняў XXVII з'езда КПСС.

Разгледжаны таксама некаторыя арганізацыйныя пытанні.

А. МАКСІМАЎ.

### АБ СТАНЕ

працоўнай і выканаўчай дысцыпліны ў структурных падраздзяленнях універсітэта ішла размова на чарговым пасяджэнні рэктарата БДУ імя У. І. Леніна. Са справаздачай па гэтаму пытанню выступіў старшыня вытворча-масавай камісіі прафкома супрацоўнікаў У. А. Габрыновіч.

І. ВАЛАСЕВІЧ.

### КАЛІ ВЫ ЖАДАЕЦЕ

пашырыць свой кругагляд, прапануем вам набыць абанемент на цыкл публічных лекцый «Краіна, народы, архітэктура» (гэта можна зрабіць у праўленні таварыства «Веды» універсітэта). Бліжэйшая лекцыя — у снежні. Яе тэма: «Астравы Зялёнага Мыса, Гвінея-Бісау». У будучым годзе лектары — вучоныя Масквы — прапануюць вам наступныя выступленні: люты — «Злучаныя Штаты Амерыкі», сакавік — «Афрыка — кантынент кантрастаў», красавік — «Японія», май — «Італія». Дарэчы, лектары доўгі час жылі за мяжой і свае выступленні суправаджаюць слайдамі, зробленымі там.

З. АЛЯКСАНДРАВА.

### З ЛЕКЦЫЯЙ

«Сацыяльна-эканамічныя аспекты перабудовы» перад грамадазнаўцамі універсітэта выступіў кіраўнік групы кансультантаў аддзела ЦК КПСС, доктар эканамічных навук, прафесар Б. М. Ладыгін.

Д. ВІЛЬКІН.

### КНІЖНАЯ ВЫСТАЎКА

«Ад дружбы ў спорце — да міру на зямлі» арганізавана аддзелам ідэйна-выхаваўчай і масавай работы бібліятэкі. Яна размешчана на трэцім паверсе галоўнага корпуса.

Ж. КРУГЛІКАВА.

МОЖНА БЫЛО РАЗЗЛАВАЦЦА: паслухайце, колькі будзем збірацца для састаўлення сцэнарыя? Ці махнуць рукой: няўжо гэта трэба мне адной?

Яна не зрабіла ні таго ні другога, а проста ўсміхнулася, і сярод агульнага гоману мякка прагучалі першыя акорды: «Ты да я, да мы с тобой...». Тым і скончыліся тады спрэчкі-размовы — атрад «Дружба» дружна заспяваў песню.

Калі прыйшло гэта ўменне ператвараць канфлікт, які набірае сілу, у дробязь, пра якую потым ніхто і не ўспомніць? Алена Румянцава, студэнтка IV курса хімічнага факультэта, і сама, напэўна, не ведае. Можа быць, калі была камандзірам? Працавалі тады байцы на цагельным заводзе. Стамляліся, ледзь дабіраліся дадому, і тут хочаш не хочаш, камандзір, падымай настрой, хаця і самому часам не да песень. А можа, ўменне прыходзіла разам з вопытам у інтэррабоце?..

Расчароўвацца? Засмучацца? Было і такое. Калі не паступіла ў медыцынскі інстытут. Але сустрэўся добры чалавек — В. І. Аржанкоў, які дапамог разгледзець цікавае і ў хіміі (вось у што яна ніколі б не паверыла!) А зараз верыць. Таму і цяжка Алене адразу назваць свой любімы прадмет: у кожным шмат чаго нязведанага і цікавага. І як вынік гэтага — за распрацоўку тэмы навуковай работы «Атрыманне і вывучэнне фізіка-хімічных уласцівасцей аксіднага жалеза-малібдэнавага каталізатара рэакцый акіслення метанолу ў фармальдэгід» узялася без боязі. Кіраўнікі Г. А. Браніцкі і С. М. Мальчанка адаслалі яе на Рэспубліканскі конкурс студэнцкіх навуковых работ.

...Наша сустрэча ў калідоры хімічнага корпуса была зусім нядоўгай — Лена спяшалася на калёквіум. У лабараторыі чакалі яе новыя адкрыцці.

З. МАРАВА. Фота А. МАКСІМАВА.



**— ЦІ ВЫБЕРУЦЬ цябе сакратаром у гэтым годзе?**

**Пытанне, якое я задала сакратару камітэта камсамола юрфака Сашу Сухаверка перад пачаткам справаздачна-выбарнага сходу, было нечаканым. І канкрэтнага адказу на яго, прызнацца, не чакала. Але пасля разважлівага «не ведаю» пачула цвёрдае «так».**

СПРАВАЗДАЧЫ І ВЫБАРЫ Ў КАМСАМОЛЕ

# Хто навучыць прынцыповасці?

ПУСТЫЯ першыя рады, што засталіся незанятымі і пасля просьб сакратара, здавалася, адлюстроўвалі пустату сходу. Аглядзеўшы аўдыторыю, дзе сабраліся будучыя юрысты, я падумала: «А ці варта чаго чакаць?». Канспекты, газеты, пабочныя размовы — тыповыя атрыбуты камсамольскіх сходаў. А што юрфак — выключэнне?

Даклад сакратара не быў успрыняты на «ура». Хто слухаў, хто працягваў праз плячо сумуючаму таварышу газету. Першую частку сходу камсамольцы лічаць самай сумнай. Ці не без падставы?

Нават у голасе некаторых выступаючых, не гаворачы пра справаздачы, гучала адно жаданне: хутчэй бы спіхнуць цяжар грамадскай работы. Згадзіцеся, выступленні павінны быць канкрэтнымі, сціслымі, але ж не сухімі. Апладысментамі сустракала аўдыторыя кіраўніка клуба «Верасень» Андрэя Бурдыку. (Прагучалі рэплікі з залы, што работа камітэта камсамола трымаецца на рабоце студклуба). Трэба аддаць належнае і красамоўнасці Мікалая Крывога, кіраўніка ідэалагічнага сектара. Але гэта былі асобныя ўспышкі. І калі ўжо, па праўдзе кажучы, нічога ад сходу не чакала, Ала Скрыга паслала з прэзідыума выратавальнае пытанне:

— Можа хто з прысутных хоча выступіць?

На сцэну падняўся Дзіма Гарачка. Перш чым перадаваць словы Дзімы, зраблю невялічкае адступленне.

Дзіма Гарачка — былы сакратар камітэта камсамола факультэта, на змену якому прыйшоў Саша Сухаверка. Што ні кажы, а ад таго, у якім стане пераходзіць у новыя рукі кіраўніцкі партфель, залежыць многае.

— Платформа, падрыхтаваная Дзімам,— надзейная.

— Камітэт камсамола дасягнуў пры ім свайго апагея.

— Мы ўсяго толькі два месяцы правучыліся на факультэце, калі сакратаром быў Гарачка, а адчулі сапраўднае жыццё...

Гэта словы Д. Сцепанюк, В. Фядорынка і інш. Ды і ўвогуле усе камсамольцы, з якімі я гутарыла, успамінаюць чамусьці мінулае, а не сённяшняе. Навошта я пішу пра мінулае?

Таму што дзіўна пакінуў Гарачка пасаду сакратара. Факультэт ажыў, сакратар — лідэр. І раптам на справаздачна-выбарным сходзе — яго самаадвод. Сход гэты, напэўна, памятаюць і выкладчыкі, і студэнты. Было некаторае разыходжанне ў меркаваннях прэзідыума і аўдыторыі. Але ніхто так пераканаўча, як сам Дзіма, не гаварыў пра тое, што не зможа ён быць сакратаром. Што гэта? Няўпэўненасць у сваіх сілах? Як упусцілі камсамольцы свайго лідэра? А на сённяшнім сходзе ён падымаецца на трыбуну. Навошта яму, пяцікурсніку, члену КПСС, ісці пасля экзамену на камсамольскі сход? Каб кінуць у аўдыторыю словы: «Хто навучыць прынцыповасці? Калі мы хочам зрабіць штосьці, не трэба хавацца за чужыя спіны. Трэба спальваць сябе, каб другім было цёпла». Можа хто паспрачаецца са мной: што гэта, як не лозунгі? Але чамусьці з вуснаў Дзімы Гарачкі яны ляцелі пераканаўча ў прыціхлую залу. Міжволі параўнала Сашу Сухаверка і Дзіму Гарачка.

Саша Сухаверка ў справаздачным дакладзе, аналізуючы свае памылкі і недапрацоўкі, адкрыта прызнаўся ў адсутнасці вопыту. Я згодна, прыйсці на змену лідэру і адразу ж стаць лідэрам самому цяжка. Таму ўпэўнена, што Сашу, гаворачы словамі юрыстаў, можна апраўдаць. Незайздросная гэта пасада — сакратар камітэта камсамола. Таму, напэўна, і жадаючых заняць яе не знайшлося.

Хаця пасля сходу, калі сакратаром застаўся Сухаверка, гучалі ўслых такія думкі:

Т. Коваль. Сакратаром не задаволена. Лічу, што трэба было перавыбраць — ніякіх арганізацыйных здольнасцей. Першы раз многія ўбачылі сакратара на сходзе. (Таню, дарэчы, падтрымалі ўсе камсамольцы, што прысутнічалі пры нашай размове).

А вось другое меркаванне:

А. Бурдыка. Сашу выбралі правільна. У яго ёсць жаданне. А галоўнае — вопыт. Не будзем паўтараць памылкі мінулага.

Шмат было сказана пра сакратара, менш чамусьці пра камітэт. І не раз я чула такі выраз: «Як чалавек Саша мне падабаецца, уважлівы, добрасумленны, але...». Дык хіба сакратар не такі ж чалавек, як усе?

Робячы нататкі са сходу, хачу спыніцца на выбарах. Яны праходзілі тут па-новаму. Камітэт камсамола факультэта звярнуўся з просьбай у камітэт камсамола універсітэта, гарком камсамола дазволіць выбары сакратара і кіраўнікоў сектараў камітэта камсамола самому сходу. Не хачу сцвярджаць, што зараз у камітэце камсамола кожны на сваім месцы. Але, як жартавалі камсамольцы, «хоць у твар будзем ведаць». А калі ведаць у твар, то можна і падысці, штосьці прапанаваць, спытаць ці вырашыць.

Калі падводзіць вынік сказанаму, то зрухаў асаблівых у рабоце камсамола няма. Адно толькі радуе: замест звыклага «за» з'явілася і нешматлікае «супраць», а больш за ўсё «устрымалася». Устрымаліся нават і ад пастановы сходу. «Не будзем галасаваць за фармальныя выразы»,— чулася з залы.

Тады на выручку прыйшоў Сяргей Балашэнка, член камітэта камсамола універсітэта. Разбілі пастанову па пунктах, першы ўвогуле выкраслілі, галасавалі за кожны асобна. Неяк па-дзіўнаму лічылі галасы. І ўрэшце прынялі. А потым высветлілася, што галоўны пункт у пастанове прапусцілі: «Даць ацэнку рабоце камітэта камсамола»...

Было відаць, што сход зацягнуўся. І яшчэ не ўнеслі прапанову закрыць яго, а на галёрцы замітусіліся. Тады, бадай, першы раз прагучаў у мікрафон голас сакратара, на гэты раз цвёрды і ўпэўнены, не просьба, а патрабаванне.

Дэбаты пачаліся пасля сходу. У. Сцепаненка выказаў думку большасці:

— Сход фармальны. Хіба можна было тут вырашыць штосьці, калі нават галасаванне было няўдалым?

Карацей кажучы, разыходзіцца не спяшаліся. Але пазней за ўсіх пойдзе дадому сакратар. Я наблізілася да Сашы Сухаверка, каб павіншаваць, падбадзёрыць. Яго словы, сказаныя перад пачаткам сходу, забыліся.

Не перадаю тут размовы з Сашам, хаця сказаць яму ёсць што. Спадзяюся, ён усё скажа сам на камсамольскіх сходах. Вопыт ёсць, жаданне «...зрабіць штосьці канкрэтнае і новае» таксама, закладзены Дзімам Гарачка фундамент — трывалы. Дык ці ж аднаму сакратару брацца за справу?

А. КРУПІЦА,
студэнтка факультэта журналістыкі.

СХОД АКТЫВУ

**Пастановы ЦК КПСС і Савета Міністраў СССР вызначылі стратэгічныя напрамкі і асноўныя шляхі павышэння якасці падрыхтоўкі спецыялістаў, якія гарантуюць выхад нашай краіны на перадавыя рубяжы навукова-тэхнічнага і сацыяльнага прагрэсу.**

# ПРЫКЛАСЦІ ЎСЕ НАМАГАННІ

## ІНТЭГРАЦЫЯ АДУКАЦЫІ, НАВУКІ І ВЫТВОРЧАСЦІ

АСНОЎНЫ рычаг перабудовы вышэйшай адукацыі — цесная інтэграцыя з навукай і вытворчасцю, пераход да новых прынцыпаў іх узаемадзеяння. Сёння нам неабходна больш эфектыўна ўкараняць новыя формы ўзаемаадносін ВНУ з прадпрыемствамі, навуковымі ўстановамі. Сярод іх — падрыхтоўка спецыялістаў па дагаворных абавязацельствах, мэтавая падрыхтоўка і перападрыхтоўка кадраў на планавай аснове.

Ужо зараз такая форма падрыхтоўкі дасягнула ў БДУ імя У. І. Леніна 30 працэнтаў. У бягучай пяцігодцы яе пажадана павялічыць удвая. Пры гэтым мэтавая падрыхтоўка павінна набыць дакладныя арганізацыйныя, прававыя і эканамічныя формы.

Пэўны вопыт у нас ёсць. Актыўна вядуць пошукі шляхоў пашырэння мэтавай падрыхтоўкі фізічны факультэт, факультэты прыкладной матэматыкі, радыёфізікі і электронікі, механіка-матэматычны. Імі заключаны доўгатэрміновыя дагаворы па падрыхтоўцы спецыялістаў для ВА «Інтэграл», «Гранат», Вылічальнай тэхнікі, НДІ ЭВМ і іншых аб'яднанняў. Пачалася мэтавая падрыхтоўка трыццаці спецыялістаў на факультэце журналістыкі. Да 60 працэнтаў павялічваецца мэтавы прыём па спецыяльнасці «правазнаўства» на юрыдычным факультэце. Гэта работа суправаджаецца адначасова пераарыентацыяй дзейнасці кафедраў, пераглядам спецыяльнасцей з мэтай іх большай адпаведнасці патрэбам эканомікі. Добрую ініцыятыву ў гэтым плане праявіў ФПМ. Факультэтам была падрыхтавана і разаслана ў зацікаўленыя арганізацыі падрабязная інфармацыя аб падрыхтоўцы спецыялістаў. Амаль ад усіх арганізацый былі атрыманы даныя аб патрэбе ў кадрах з указаннем спецыялізацыі. З улікам гэтага былі падрыхтаваны новыя вучэбныя планы.

Для таго, каб наблізіць вучобу да патрэб навукі і вытворчасці, фізфак, факультэт радыёфізікі і электронікі, ФПМ, мехмат стварылі 17 філіялаў, кафедраў у акадэмічных інстытутах, на ВА «Інтэграл», «Гранат», у Вярхоўным судзе БССР. Факультэт журналістыкі рыхтуе дагавор аб стварэнні аб'яднання «БДУ — Дзяржтэлерадыё БССР».

Новай перспектыўнай формай інтэграцыі сталі круглагадовыя студэнцкія навукова-вытворчыя атрады. Так, на «Інтэграле» працуюць НВА, у якія ўвайшлі студэнты механіка-матэматычнага, фізічнага, хімічнага факультэтаў, ФПМ, факультэта радыёфізікі і электронікі. Гэта работа дазваляе студэнтам не толькі далучацца да грамадска карыснай працы, але і знаёміцца з эканомікай вытворчасці, сучаснымі формамі арганізацыі і аплаты працы, прымаць удзел у грамадскім жыцці працоўнага калектыву.

Пры ўсім станоўчым можна прывесці і прыклады нашай пасіўнасці, прыхільнасці да старых метадаў работы. Ці не гэтым тлумачыцца той факт, што работа па абнаўленню спецыялізацыі ідзе марудна. За апошнія два гады, на жаль, уведзена толькі шэсць новых спецыялізацый. Не праяўляюць пакуль асобай актыўнасці многія кафедры і факультэты ў пытанні ўмацавання сувязі вучобы з практыкай. Слаба развіваюцца і іншыя формы інтэграцыі вучэбнага працэсу з вытворчасцю і навукай, недастаткова выкарыстоўваецца ў вучэбным працэсе навукова-тэхнічны патэнцыял галін народнай гаспадаркі.

## ХОД ПЕРАБУДОВЫ ВУЧЭБНАГА ПРАЦЭСУ

ПАДНЯЦЬ якасць падрыхтоўкі спецыялістаў немагчыма без перабудовы вучэбнага працэсу. Галоўны напрамак у гэтай рабоце — паварот ад масавага, валавога навучання да ўзмацнення індывідуальнага падыходу, развіцця творчых і арганізацыйных здольнасцей будучых спецыялістаў з апорай на самастойную работу студэнтаў, актыўныя формы і метады навучання. Творча падыходзяць да гэтай работы механіка-матэматычны, фізічны факультэты, журфак, факультэт радыёфізікі і электронікі, кафедры ўраўненняў матэматычнай фізікі, фізіялогіі чалавека і жывёл, археалогіі і іншыя.

Практычна на ўсіх факультэтах прыступілі да скарачэння абавязковых аўдыторных заняткаў. Распрацаваны новыя вучэбныя і рабочыя планы, якія прадугледжваюць павелічэнне



аб'ёму самастойнай работы студэнтаў пад кантролем выкладчыкаў. Добрай ініцыятывай факультэтаў стала распрацоўка метадычных рэкамендацый па арганізацыі самастойнай работы студэнтаў, развіццю форм і метадаў кантролю.

На механіка-матэматычным факультэце, напрыклад, за кошт скарачэння лекцыйнай нагрузкі кожны тыдзень пяць гадзін вучэбнага часу адводзіцца на самастойную падрыхтоўку студэнтаў. Для кантролю шырока выкарыстоўваюцца гутаркі, пісьмовыя апытанні, калёквіумы. Два разы ў месяц студэнты трымаюць справаздачу па выніках самастойнага вывучэння дысцыплін.

Тут дарэчы адзначыць, што перабудова вучэбнага працэсу ў нас, на жаль, ідзе марудна. Некаторыя факультэты не праяўляюць належнай ініцыятывы ў скарачэнні колькасці вывучаемых дысцыплін за кошт іх аб'яднання, у практыцы здачы аднаго экзамену па курсу, які чытаецца на працягу некалькіх семестраў, ва ўстанаўленні студэнтам старэйшых курсаў індывідуальных планаў падрыхтоўкі.

Нашы поспехі і недахопы ў перабудове вучэбнага працэсу ярка праявіліся і ў выніках летняй экзаменацыйнай сесіі. Яна паказала, што, з аднаго боку, перабудова садзейнічала больш сістэматычнай рабоце студэнтаў над вывучаемым матэрыялам, а з другога — узрастанне патрабаванняў да ўзроўню ведаў студэнтаў прывяло да зніжэння агульнай паспяховасці (па дзённай форме навучання ў параўнанні з мінулым годам на 2,25 працэнта). Знізілася, у параўнанні з мінулым годам, колькасць выпускнікоў, якія атрымалі дыплом з адзнакай.

Не зраблю вялікага адкрыцця, калі скажу, што поспех перабудовы залежыць ад работы прафесарска-выкладчыцкага саставу. У нас нямала педагогаў ініцыятыўных, зацікаўленых, творчых.

Хаця, згадзіцеся, энтузіястаў і наватараў у нас пакуль менш, чым тых, хто прывык працаваць па-старому, без належнай ініцыятывы і адказнасці. Пра гэта гаворыць і той факт, што многія кафедры не толькі не ўзмацнілі, а нават аслабілі работу па ўкараненню ў вучэбны працэс НДР. Калі ў мінулым годзе іх было ўкаранёна 170, то ў гэтым — толькі 56. Самы нізкі паказчык тут на юрыдычным факультэце, не вышэйшы і на ФПМ і фізфаку. Лепш ідуць справы на геафаку і біяфаку.

Неабходна і далейшае павышэнне метадычнага ўзроўню выкладчыкаў па выкарыстанню ТСН. Відавочна, наспела неабходнасць у стварэнні ва універсітэце кафедры методыкі выкладання і ТСН.

## РАЗВІЦЦЁ НАВУКІ

ПЕРАБУДОВА вышэйшай школы ў галіне навукі прадугледжвае павелічэнне ў два-тры разы аб'ёму фундаментальных даследаванняў і даследаванняў прыкладнога характару. Як жа ідуць справы ў гэтым напрамку ў БДУ?

У 1986 годзе ў БДУ выкананы аб'ём НДР на агульную суму 17,8 млн. руб., распрацоўвалася 424 тэмы, атрымана 275 станоўчых рашэнняў па заяўках на вынаходствы. Эканамічны эфект ад укаранення завершаных распрацовак склаў 21,7 млн. руб. Вялікую работу па ўкараненню распрацовак праводзіць СКТБ з доследнай вытворчасцю.

Але самае важнае тое, што навуковая тэматыка універсітэта з'яўляецца актуальнай. Больш паловы тэм выконваецца па заданнях саюзных, рэспубліканскіх і галіновых праграм. Цесныя сувязі нашы вучоныя наладзілі з ВА «Інтэграл», «Гарызонт», «Планар», «Беларуськалій», НВА парашковай металургіі, НДІ ЭВМ. Вялікі аб'ём навукова-даследчых работ выконваюць НДІ ПФП і НДІ ФХП БДУ.

Вялікая ўвага ва універсітэце ўдзяляецца развіццю новых форм арганізацыі навуковых даследаванняў. З гэтай мэтай працягваецца работа па стварэнню новых навукова-вытворчых аб'яднанняў з буйнымі арганізацыямі — «Вылічальная тэхніка» і «Гарызонт». Утвораны навукова-вытворчыя лабараторыі на базе факультэта прыкладной матэматыкі і фізфака.

Сумесна з Кіраўскім заводам (Ленінград) і адной з клінік Масквы арганізаваны часовы калектыў «Сістэма» з мэтай стварэння (на аснове распрацовак вучоных БДУ), асваення і ўкаранення ў вытворчасць тыпавой сістэмы прафілактычнага медыцынскага агляду насельніцтва. Заўважу, што універсітэт першым у сістэме МінВНУ БССР перайшоў на новую сістэму аплаты працы навуковых супрацоўнікаў.

У 1988 годзе запланавана правядзенне атэстацыі прафесарска-выкладчыцкага саставу, які ўдзельнічае ў выкананні гаспадарча-дагаворных НДР на ўмовах унутрывузаўскага сумяшчальніцтва.

Аднак у ходзе перабудовы навукі дакладна выявіліся многія нашы недахопы, узніклі дадатковыя цяжкасці. Нягледзячы на паляпшэнне вынаходніцкай дзейнасці вучоных універсітэта, што знаходзіць сваё адлюстраванне ў павелічэнні колькасці атрыманых аўтарскіх пасведчанняў, не адбылося якаснага зруху. Няма ніводнага вынаходства, рэалізаванага за мяжой.

Патрэбна спыніцца вось на чым. Многія кафедры універсітэта выконваюць гаспадарча-дагаворныя работы. Але на многіх з іх яны нізкаэфектыўныя: на некаторых аддача складае 38 капеек на рубель затрат, на некаторых — 32, 26 і нават 6 капеек. Але гэта не рэкорд. Кафедры цеплафізікі, тэарэтычнай механікі, метадаў аптымальнага кіравання, матэматычнага забеспячэння ЭВМ, біяхіміі не пацвердзілі ніякай эканамічнай эфектыўнасці сваіх гаспадарча-дагаворных НДР.

Важным фактарам развіцця навукі ва універсітэце і павышэння ўзроўню падрыхтоўкі спецыялістаў з'яўляецца навукова-даследчая работа студэнтаў. Усімі формамі НДР зараз ахоплена амаль 6 тысяч студэнтаў дзённай формы навучання. Яны ўдзельнічалі ў выкананні 340 планавых тэм. Самастойна і ў сааўтарстве апублікавана 387 артыкулаў і дакладаў, 13 студэнтаў сталі сааўтарамі вынаходстваў. У летні перыяд яны залічваюцца на работу ў арганізацыі — заказчыкі НДР. Каля 180 студэнтаў удзельнічаюць у рабоце па дагаворах аб навукова-тэхнічным супрацоўніцтве з прадпрыемствамі: НДІ арганізацыі кіравання будаўніцтвам, НДІ анкалогіі Міністэрства аховы здароўя БССР, Інстытутам геахіміі і геафізікі АН БССР. Студэнт ІІІ курса ФПМ Д. Дварцавы стаў пераможцам Усесаюзнай алімпіяды па праграміраванню.

Разам з тым магчымасці развіцця навуковай творчасці студэнтаў мы выкарыстоўваем яшчэ не на поўную магутнасць. З кожным годам скарачаецца ўдзел студэнтаў у выкананні гаспадарча-дагаворных работ па сумяшчальніцтву. Асабліва мала іх на механіка-матэматычным, геаграфічным, біялагічным факультэтах.

Планаванне НДРС таксама часта вядзецца фармальна, дрэнная яе забяспечанасць матэрыяламі і абсталяваннем. Далучэнне студэнтаў да навуковай работы на некаторых кафедрах вядзецца бессістэмна. Ёсць выпадкі, калі навукова-метадычная работа па фарміраванню ў студэнтаў творчых навыкаў падмяняецца дробязнай апекай.

## НАВУКОВА-ПЕДАГАГІЧНЫЯ КАДРЫ

НАШЫ далейшыя поспехі ў вучэбна-выхаваўчай рабоце, у развіцці навуковых даследаванняў цалкам залежаць ад паляпшэння якаснага саставу кіруючых і навукова-педагагічных кадраў.

Зараз ва універсітэце працуюць 1786 навукова-педагагічных супрацоўнікаў. Педагагічную работу на 103 кафедрах вядуць 1338 выкладчыкаў. У іх ліку 4 акадэмікі і члены-карэспандэнты АН БССР, 102 дактары навук, прафесары, 722 кандыдаты навук, дацэнты. Нядаўна зацверджана новае палажэнне аб парадку замяшчэння пасад і атэстацыі прафесарска-выкладчыцкага саставу, якое дазволіць далучыць да педагагічнай работы найбольш вопытных, падрыхтаваных, палітычна сталых работнікаў, якія маюць глыбокія прафесійныя веды і навуковыя дасягненні.

Каб прымаць правільныя рашэнні ў даных умовах, патрэбна шырока выкарыстоўваць і развіваць дэмакратычныя формы кіравання. Гэтаму мы павінны вучыцца ўсе, улічваючы, што дэмакратыя — не толькі расшырэнне правоў, але і павышэнне адказнасці за прымаемыя рашэнні. З гэтай мэтай расшыраны састаў савета універсітэта, у які акрамя абавязковых членаў уведзены прадстаўнікі прафесарска-выкладчыцкага саставу факультэтаў, чвэрць членаў савета складаюць зараз студэнты і аспіранты. А многія конкурсныя пытанні вырашаюцца зараз на месцах, у саветах факультэтаў.

Карыстаючыся выпадкам, спынюся на аспірантуры. Сёння ва універсітэце вучыцца 400 аспірантаў па 84 навуковых спецыяльнасцях. Аднак эфектыўнасць нашай аспірантуры пакуль яшчэ нізкая. У мінулым годзе яе закончылі 134 чалавекі. З іх у тэрмін абаранілі дысертацыі толькі 9 чалавек і 62 падалі работы да абароны. Не зрабілі гэтага ў тэрмін аспіранты па спецыяльнасцях «геаметрыя і тапалогія», «фізіка атамнага ядра і элементарных часціц», «цеплафізіка», «радыёфізіка». На жаль, не ўсе дактары вядуць кіраўніцтва аспірантамі. Са 102 дактароў навук, што працуюць ва універсітэце, робяць гэта толькі 69. На высокім узроўні работа ў даным напрамку на кафедры гісторыі КПСС і марксісцка-ленінскай філасофіі гуманітарных факультэтаў, рускай мовы. Высокі ўзровень падрыхтоўкі аспірантаў у прафесараў У. К. Коршука, Р. Ф. Габасава, П. П. Шубы, А. Я. Супруна.

## КАМУНІСТЫЧНАЕ ВЫХАВАННЕ І САМАКІРАВАННЕ

У РАШЭННІ задач паскарэння сацыяльнага і эканамічнага развіцця ўзрастае роля выхавання гарманічна развітой, грамадска актыўнай асобы спецыяліста, значэнне ідэйна-выхаваўчых функцый.

У нас гэта работа ў апошні час значна ажывілася. У ідэйна-маральным і патрыятычным выхаванні сталі больш шырока выкарыстоўвацца грамадска-палітычная практыка, Ленінскі залік, «зорныя» паходы па месцах рэвалюцыйнай, баявой і працоўнай славы савецкага народа. Больш за дзве тысячы студэнтаў удзельнічаюць у мастацкай самадзейнасці. На факультэтах і ў інтэрнатах створаны аматарскія аб'яднанні па інтарэсах, дыскусійныя клубы. Добрай ініцыятывай камітэта камсамола стала адкрыццё ў банку спецрахунку аматарскіх аб'яднанняў для фінансавання культурна-масавых мерапрыемстваў.

Больш за 2 200 студэнтаў прынялі ўдзел у трэцім працоўным семестры. 85 студэнцкіх атрадаў асвоілі больш за 3 млн. рублёў капітальных укладанняў. Пералічана ў грамадска карысныя фонды звыш 52 тыс. руб. Паспяхова правялі працоўны семестр атрады юрыдычнага, фізічнага, механіка-матэматычнага факультэтаў.

Вялікія рэзервы росту эфектыўнасці выхавання бачацца ў павышэнні грамадска-палітычнай актыўнасці самой моладзі, у развіцці ўсіх форм яе самакіравання і самадзейнасці. Студэнцкае самакіраванне дзейнічае ў нас ужо больш за два гады. Найбольш развітыя формы набыло яно на механіка-матэматычным факультэце. Тут дзейнічае прынцып калектыўнай адказнасці студэнтаў за вынікі сваёй вучобы і паводзін. У апошні час самакіраваннем студэнтаў сталі больш займацца на ФПМ, юрфаку, фізфаку, гістфаку. Слаба асвойваюцца элементы яго на біяфаку, філфаку, факультэце радыёфізікі і электронікі.

Спадзяюся, кожны разумее, што на фарміраванне актыўнай жыццёвай пазіцыі, высокай палітычнай і маральнай культуры студэнцкай моладзі, удасканаленне форм і метадаў ідэйна-палітычнага выхавання павінны быць накіраваны сёння намаганні ўсяго калектыву універсітэта.

**Л. КІСЯЛЕЎСКІ,**
**рэктар БДУ імя**
**У. І. Леніна,**
**акадэмік АН БССР.**

## ДНІ ДОНАРА

# Яны дораць жыццё

НІ ДЛЯ КАГО не сакрэт, што тысячы і тысячы жыццяў, здароўе людзей ратуе кроў донара. Кроў — асобае, ні з чым не параўнальнае біялагічнае лякарства, якое немагчыма падрыхтаваць штучным шляхам ні на якіх фабрыках. Затое колькі карысных прэпаратаў вырабляецца з крыві: альбумін, сываратка «Ф», сухая плазма, гама-глабулін і многія іншыя. Яны незамяняльныя пры лячэнні цяжкіх захворванняў. Для іх вырабу адзінай сыравінай з'яўляецца кроў здаровага чалавека — кроў донара.

Слова «донар» у перакладзе з лацінскага азначае «які дорыць». Усіх донараў аб'ядноўвае адно цудоўнае пачуццё — дапамагчы чалавеку. Нездарма донараў называюць людзьмі добрага сэрца.

Любы здаровы чалавек ва ўзросце ад 18 да 60 гадоў можа быць донарам. Без усялякай шкоды для свайго здароўя донар можа раз у 60 дзён здаваць да 400 мілілітраў крыві. Людзі, якія пастаянна здаюць сваю кроў, адчуваюць сябе здаровымі, бадзёрымі, жыццярадаснымі. У іх пастаянна трэніруецца крывяносная сістэма, а гэта вядзе да амаладжэння арганізма.

У дзень здачы крыві донар вызваляецца ад работы, а студэнт — ад заняткаў. Акрамя таго, донарам даецца адпачынак на наступны дзень, а тым, хто працуе, гэты дзень, па жаданню, увойдзе ў водпуск.

Патрэбна адзначыць, што донары ўзнагароджваюцца ганаровымі значкамі «Донар СССР» 3-х ступеней, а тыя, хто здаваў сваю кроў сорак і болей разоў — нагрудным знакам «Ганаровы донар СССР». Ганаровыя донары карыстаюцца шматлікімі перавагамі: пры размеркаванні пуцёвак у дамы адпачынку і санаторыі, пры наведванні паліклінік і г. д. Той, хто марудзіць ці сумняваецца, быць яму донарам ці не, павінен памятаць: донарская кроў патрэбна кожна дзень, кожны час.

У апошнія гады паявілася вельмі важная катэгорыя донараў — донары-сваякі. Установлена, што кроў сваяка дае лепшы лячэбны эфект. Яна больш сумяшчальная, раўназначная па сваіх біялагічных якасцях. Таму патрэбна мець на ўвазе, што хвораму, які мае патрэбу ў пераліванні крыві, перш за ўсё павінен дапамагчы блізкі, родны чалавек.

Ні адзін з відаў сучаснай медыцынскай дапамогі не мае такой вялікай патрэбы ў падтрымцы насельніцтва, як прымяненне пералівання крыві, якое заснавана на донарстве і цалкам залежыць ад яго. Далейшае развіццё донарства павінна абапірацца на прынцып: кожны член грамадства мае роўнае права на атрыманне крыві ў выпадку захворвання, але і кожны маральна абавязаны прыняць добраахвотны ўдзел у донарстве хоць бы некалькі разоў у жыцці, бо кроў донара нясе жыццё.

Л. ПАНКРАТАВА,
загадчыца аддзялення пералівання крыві 2-й гарадской клінічнай бальніцы.

## КАНФЛІКТНАЯ СІТУАЦЫЯ

# Месца ля акна

СУТНАСЦЬ канфліктаў паміж савецкімі і замежнымі студэнтамі так і засталася б для мяне да канца незразумелай, калі б не адно здарэнне.

Калі расказваць у двух словах, мы проста не падзялілі месца. У пакоі інтэрната, дзе звычайна пражываюць чатыры чалавекі, аднаму з нас яго не хапіла. У ролі бяздомнага апынуўся я сам, калі ў пачатку навучальнага года завітаў у свой пакой № 609 інтэрната № 2. Было за поўнач і па тлумачэнні прыйшлося звярнуцца на другі дзень.

— Куды ж дзеўся мой ложак?

— Не ведаю,— пачулася ў адказ.

Між тым, у час майго ад'езду на практыку (яшчэ ў канцы жніўня) ён стаяў ля акна, побач з ложкам майго новага суседа — першакурсніка Аг Хамітэ. І ўся далейшая размова складалася з адмаўленняў Го Сейду, які засяліўся апошнім: маўляў, ён мае права займаць месца, якое пажадае.

Але ж мы ў гэтым пакоі жывём ужо другі год, рабілі за свае грошы рамонт і збіраемся жыць тут да пятага курса.

Нічога не хачу ведаць. Рабілі рамонт? Здзірайце шпалеры са сцен і ідзіце ў другі пакой, калі не падабаецца тут.

З дапамогай прадстаўнікоў, якія непасрэдна працуюць з замежнымі студэнтамі, усё ж такі ўдалося даведацца, што ложак не знік сам па сабе, як сцвярджаў Сейду, а вынеслі яго нашы новыя жыхары.

Прадбачу, што нехта ад маіх тлумачэнняў ужо прытаміўся: навошта ўсё гэта? Але, згадзіцеся, вось з-за такой дробязі і адбываецца шматлікая колькасць канфліктаў, якія прыносяць столькі клопатаў дэканатам і камендантам інтэрнатаў, студсаветам і г. д.

— Чаго вы дамагаецеся? Так, як вы хочаце жыць, у інтэрнаце амаль ніхто не жыве,— у размове з намі заўважыў Го Сейду.

Вельмі цікавае сцвярджэнне. Горш за ўсё, што гэта сапраўды так. Атрымліваецца, неабходнае правіла ёсць, але яго не вельмі прытрымліваюцца. Так паціху яно ператварылася ў выключэнне, па якому замежныя студэнты «павінны» сяліцца з абодвух бакоў акна.

І гэта, на жаль, не адзінае правіла, якое ігнаруецца. Нельга карыстацца ў інтэрнаце электрапрыладамі — карыстаюцца. І савецкія, і замежныя студэнты. Пакуль што (маю на ўвазе інтэрнат № 2) абыходзіцца без пажараў, але бяда заўсёды прыходзіць знянацку. Забаронена ў пакоях адгароджвацца адзін ад другога і мець шафы, канапы. Адгароджваюцца, купляюць. Гэта пакуль што надзейна «узаконена». Ва ўсялякім разе ў інтэрнаце № 2 адміністрацыі і студсавету не хапае, напэўна, сіл і жадання скрануць гэты цяжкі воз з месца. Правілы існуюць толькі на паперы, і гэта ведае кожны, хто жыве тут. Праўда, праходзяць шматлікія праверкі, агляды пакояў, робяцца заўвагі, толькі станоўчых вынікаў яны не даюць.

Што ж, не чапаць ліха, пакуль яно спіць ціха? Дзе ж выйсце? Можа, як ні банальна гэта гучыць, у сумеснай працы студсаветаў, дэканатаў, адміністрацыі студгарадка. І жыхароў. Калі ж хто-небудзь з іх зноў не падтрымае, далейшых змен можна не чакаць.

...Канфлікт, які адбыўся ў нас, рассудзілі справядліва, і Го Сейду жыць з намі не пажадаў, не згадзіўшыся на другое месца, не ля акна. Дзесьці ён абавязкова знойдзе пакой па густу, бо правілы пакуль што... дыктуе ён.

А. МАКСІМАЎ.

**АД РЭДАКЦЫІ.** Безумоўна, выказаныя тут думкі маюць суб'ектыўны характар. Некаму яны з першага погляду здадуцца дробязнымі, каб аб іх весці размову ў газеце. Але нельга супярэчыць таму, што такія вось, здавалася б, дробязі робяць значны ўплыў на атмасферу супольнага пражывання студэнтаў і, нарэшце, на інтэрнацыянальнае выхаванне. Каб хоць крыху пазбегнуць канфліктаў, неабходна пры засяленні ў інтэрнаты ўлічваць псіхалогію, інтарэсы, схільнасці савецкіх і замежных студэнтаў. Але хто зоймецца гэтым і ў якой ступені?



## УВАГА: СЛОВА МЕДЫКУ

# ШЛЯХ У НІКУДЫ

СЛОВА «наркаманія» утворана з грэчаскіх слоў. Тэрмін «наркаманія» ужываецца для вызначэння стану псіхічнай і фізічнай залежнасці чалавека ад наркатычных сродкаў. Усе яны адрозніваюцца паміж сабой па спосабу ўжывання, па саставу і паходжанню, па характару адчуванняў, якія атрымліваюцца ў выніку іх прымянення, па маштабу небяспекі, звязанай з выкарыстаннем пэўных відаў.



Клініка наркаманіі і ступень выражанасці сімптомаў залежаць ад віду наркатычнага рэчыва, дозы, спосабу ўвядзення, а таксама ад узросту і стану таго, хто яго прымае. Таму нельга дакладна ахарактарызаваць тыповую клініку наркаманіі, але такія прызнакі, як псіхічная і фізічная залежнасць, дэградацыя асобы з'яўляюцца характэрнымі для ўсіх відаў наркаманіі. Асабліва патрэбна падкрэсліць, што прывыканне, псіхічная і фізічная незалежнасць надыходзяць хутка, а пры ўжыванні некаторых наркотыкаў ужо праз некалькі тыдняў лячэнне становіцца малаэфектыўным. Паступова развіваюцца необарачальныя змены ў печані, нырках, разбураецца ўвесь арганізм, адзначаецца зніжэнне памяці, а ўсе інтарэсы ў асноўным зводзяцца да здабычы наркотыкаў. Прыкладам можа служыць пісьмо-споведзь наркамана.

«Я захварэў гэтай страшэннай хваробай. Назад дарогі няма, і хочацца папярэдзіць урачоў, каб яны былі больш міласэрныя да сваіх пацыентаў. Не змрочны стан, а павольная смерць авалодвае наркаманам, як толькі вы на час ці на два пазбавіце яго наркотыка. Паветра не сытнае, яго нельга глытаць, а кожная клетачка прагне лекаў. Не, гэтага нельга растлумачыць, нельга зразумець. Словам, чалавека няма, ён нічога не хоча, ні пра што не думае, акрамя як пра морфій. Смерць ад смагі — райская смерць у параўнанні з прагай наркотыка. Напэўна, так зажыва пахаваны ловіць кожную кроплю паветра, раздзіраючы скуру на грудзях.

Смерць, страшная, павольная смерць...»

Тут дарэчы адзначыць, што прычыны смяротных выпадкаў у наркаманаў розныя: перадазіроўка таксічнага рэчыва, цяжкія паражэнні ўнутраных органаў, няшчасныя выпадкі і траўмы, спробы самагубства (сярод мужчын іх робіць кожны шосты наркаман, а сярод жанчын — кожная чацвёртая).

Якія ж матывы абумоўліваюць узнікненне прывычкі да прыёму наркотыкаў? Перш за ўсё — цікаўнасць, жаданне адчуць уздзеянне наркотыка на сабе, а часта гэта выражэнне сваёй незалежнасці.

Расказвае Каця Р., вучаніца восьмага класа, якая наведвала падвал жылога дома, дзе яе навучылі глытаць таблеткі: «Спачатку мы проста так хадзілі туды, грэліся. Я магнітафон прыносіла, слухалі музыку. Аднойчы падышоў да мяне незнаёмы хлопец. Хочаш, гаворыць, глюк злавіць? А што гэта такое, пытаюся. А ён у адказ: «Вось праглынеш гэтыя таблеткі, і ў цябе перад вачыма розныя каляровыя малюнкі паявяцца, як у мультфільмах». Тады даў мне нейкія таблеткі, сказаў, каб не баялася, што гэта лекі ад сэрца і ад іх шкоды не будзе. Ну, я і выпіла адразу дзесяць таблетак. Ніякіх прывідаў. Прыйшла дадому, таксама нічога не адчуваю. Выпіла тады яшчэ дзесяць. І раптам бачу: мая галава ад шыі аддзялілася і да фортачкі плыве. Я за ёю, а яна ад мяне. Каля самай фортачкі мая галава абярнулася, паказала мне язык і вылецела на вуліцу. Я крычу: «Стой! Стой!». Далей нічога не памятаю».

Амаль заўсёды пасля першага прыёму наркотыка абавязкова наступае другі, трэці. Гэтыя людзі не ўсведамляюць да канца свае паступкі і тое, які небяспечны наркотык для арганізма. Яны разлічваюць на тое, што змогуць у любы момант спыніцца, кінуць назаўсёды. На жаль, гэта не так.

Нядаўна ў адным з раёнаў скончыў жыццё самагубствам Сяргей Б. Такая смерць заўсёды выклікала шмат пытанняў: «Як змог? Што пхнула на гэта?». І не на кожнае з іх лёгка адказаць.

Аднойчы «дваровы настаўнік» сабраў хлопцаў у падвале дома. У перапынку расказу аб нейкім другім, патаемным жыцці ён прапанаваў Сярожу панюхаць змесціва бутэлькі. Не думаючы, на поўныя лёгкія хлопец удыхнуў пары. Яго чуць не званітавала. Усе дружна засмяяліся. Каб не страціць аўтарытэт сярод аднагодкаў, ён паўтарыў усё спачатку. У вушах зазвінела, перад вачыма нешта паплыло.

Пасля гэтага падвал прыцягваў, як магніт. Куплены на сэканомленыя капейкі хімікат дапамагаў не думаць пра засмучаную маці. На здзіўленне, яго першы начлег у падвале асаблівай трывогі дома не выклікаў. Праўда, надакучалі суседзі, якія часам заходзілі ў падвал, а пасля таго, як там пачалі прападаць рэчы, Сярожу давялося даваць тлумачэнні ў міліцыі, а маці — у камісіі па справах непаўналетніх. Сярожа даў слова паправіцца, жыць і вучыцца, як усе. Але вытрымкі хапіла ненадоўга, хацелася ранейшых, падвальных адчуванняў. Хлопец стаў некіруемы. Над яго жыццём і жыццём некаторых яго сяброў навісла смяротная небяспека. Першым не выграмаў Сяргей.

У апошняе імгненне хлопец успомніў пра маці і паспешліва напісаў ёй запіску: «Я жыццё сваё пражыў. Дзякуй табе за ўсё».

Вось так, не па-дзіцячы сур'ёзна і катэгарычна падвёў ён вынік усяго свайго жыцця. А жыцця таго было няпоўных пятнаццаць гадоў.

Гэты прыклад яшчэ раз яскрава сведчыць аб тым, што няма небяспечнага прыёму наркотыка, няма першай і адзінай яго порцыі.

Памятайце! Наркотыкі з'яўляюцца непераадольнай перашкодай у развіцці паўнацэннага, здаровага чалавека.

Л. ГРЫШЭЛЬ,
урач 2-й гарадской клінічнай бальніцы.

